Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная
бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел маркетынгу

# ШЛЯХ МУЖНАСЦІ І СЛАВЫ:

*работа бібліятэк па патрыятычным выхаванні моладзі*

Гродна, 2023

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
Гродзенская гарадская цэнтральная
бібліятэка імя А. Макаёнка
Аддзел маркетынгу

# ШЛЯХ МУЖНАСЦІ І СЛАВЫ:

## работа бібліятэк па патрыятычным выхаванні моладзі

Гродна, 2023

Укладальнік: А. С. Рубель

Рэдактар: Н. Ю. Наземцава

Метадычны дапаможнік

Шлях мужнасці і славы: работа бібліятэк па патрыятычным выхаванні моладзі : метадычны дапаможнік / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, аддзел маркетынгу ; уклад. А. С. Рубель, рэд. Н. Ю. Наземцава. — Гродна, 2023. — 20 с.

На старонках дапаможніка прадстаўлены матэрыялы, у якіх раскрываюцца формы масава-інфармацыйнай дзейнасці па патрыятычным выхаванні дзяцей, падлеткаў і моладзі, метады папулярызацыі ваенна-гістарычнай кнігі ў бібліятэцы.

© Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», 2023

# ЗМЕСТ

Уступ 3

Даты. Падзеі 4

Мерапрыемствы да Дня Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне 5

Конкурсы да мерапрыемстваў патрыятычнай тэматыкі 9

Выставы да Дня Перамогі 11

Бібліятэка online 13

Матэрыялы для падрыхтоўкі мерапрыемстваў
па выхаванні патрыятызму 14

# ШЛЯХ МУЖНАСЦІ І СЛАВЫ:
## работа бібліятэк па патрыятычным выхаванні моладзі

## УСТУП

Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне дзяцей, падлеткаў і моладзі заўсёды было адной з найважнейшых задач грамадства. Для выхавання годнага грамадзяніна, патрыёта неабходна фарміраваць у падрастаючага пакалення пачуццё адданасці роднай зямлі, павагі да гістарычнага мінулага краіны.

У сістэме сацыяльных інстытутаў, якія займаюцца патрыятычным выхаваннем, бібліятэцы адводзіцца важнае месца. Патрыятызм – гэта звяно, якое аб'ядноўвае розныя пакаленні. Бібліятэкі здольныя збіраць і захоўваць інфармацыю аб родным краі і яго людзях, папулярызаваць гэтыя веды, далучаць да іх грамадства, што з'яўляецца важкім фактарам у выхаванні патрыятызму.

Сёння памяць аб былых падзеях жыве на старонках кніг, ва ўспамінах удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны, у фотаздымках, архіўных дакументах, даследчых работах, што месцяцца на кніжных выставах і тэматычных экспазіцыях бібліятэк. Усё гэта разам – гістарычная памяць народа, якая аб'ядноўвае пакаленні і з'яўляецца надзейным залогам будучыні.

Мэта бібліятэк – перадаць маладому пакаленню эстафету памяці пра мінулае краіны, пра веліч подзвігу тых, хто коштам свайго жыцця адваёўваў для нас мірнае жыццё. Адна з галоўных задач дзейнасці – далучыць дзяцей, падлеткаў і моладзь да чытання, да роднага слова, да гісторыі Беларусі.

Прапануемыя мерапрыемствы накіраваны на захаванне пераемнасці пакаленняў і фарміраванне патрыятызму ў падлеткаў і моладзі, выхаванне пачуцця гонару, павагі да гістарычнага мінулага Беларусі. Мэта метадычнага дапаможніка – удасканаленне сістэмы патрыятычнага выхавання карыстальнікаў бібліятэк, развіццё праз чытанне і кнігу ў моладзі патрыятычнай свядомасці, грамадзянскасці.

## ДАТЫ. ПАДЗЕІ

У дзейнасці па патрыятычным выхаванні, фарміраванні ўяўлення ў падрастаючага пакалення аб падзеях ваеннага часу, пры папулярызацыі літаратуры гістарычнай тэматыкі бібліятэкі плануюць і праводзяць мерапрыемствы, прымеркаваныя да значных памятных дат у гісторыі краіны:

**27 студзеня** – Міжнародны дзень памяці ахвяр Халакосту.

**15 лютага** – Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў.

**21 лютага –** Міжнародны дзень роднай мовы.

**23 лютага –** Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

**15 сакавіка** – Дзень Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**2 красавіка –** Дзень яднання народаў Расіі і Беларусі.

**11 красавіка** – Міжнародны дзень вызвалення вязняў фашысцкіх канцлагераў.

**18 красавіка** – Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін.

**1 Мая –** Свята працы.

**9 мая** – Дзень Перамогі.

**Другая нядзеля мая –** Дзень Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

**22 чэрвеня** – Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа.

**3 ліпеня** – Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь.

**16 ліпеня** – Дзень вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**2 верасня** – Дзень заканчэння Другой сусветнай вайны.

**17 верасня** – Дзень народнага адзінства ў Рэспубліцы Беларусь.

**7 лістапада** – Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года.

# МЕРАПРЫЕМСТВЫ ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ Ў ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ

Самым трагічным і адначасова гераічным перыядам гісторыі для беларускага народа стала Вялікая Айчынная вайна. З ворагам у вайну разам з салдатамі змагаліся сталыя людзі, жанчыны і дзеці. Унёсак беларускага народа ў барацьбу з фашызмам быў высока ацэнены іншымі дзяржавамі. У пасляваенны час усе сілы беларускага народа былі накіраваны на аднаўленне краіны, адраджэнне гарадоў і вёсак.

Патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення неабходна грунтаваць на прыкладах подзвігу яго папярэднікаў. Памяць – гэта тыя рэчы, якія засталіся ад нашых продкаў, успаміны, творы, на старонках якіх адбываецца мастацкая рэканструкцыя мінулага, дзейнічаюць рэальныя гістарычныя асобы.

Імкненне да годнага азнаменавання памятных дат ставіць перад бібліятэкарамі канкрэтныя задачы і, у першую чаргу, пошук новых форм, падыходаў і ідэй для арганізацыі і правядзення шматлікіх сацыякультурных мерапрыемстваў. Гэта рэквіем-акцыі, літаратурныя гасцёўні, літаратурна-музычныя вечарыны, вечары памяці, тыдні ваеннай кнігі, урокі баявой славы і мужнасці, гістарычныя рэпартажы, выставы-ўспаміны і інш.

У сістэме мерапрыемстваў па выхаванні патрыятызму частка масава-інфармацыйнай дзейнасці бібліятэк здзяйсняецца праз рэалізацыю разнастайных **праектаў і праграм** сумесна з зацікаўленымі арганізацыямі і ўстановамі. Тэмы праектаў па патрыятычным выхаванні могуць быць наступныя:

- «Гісторыя, авеяная славай»;
- «Жыві і помні»;
- «Мы памятаем! Мы ганарымся!»;
- «Памяць пакаленняў»;
- «Чытаем і памятаем».

**Рэквіем-акцыі** прадстаўляюць сабой комплекс бібліятэчных мерапрыемстваў, да ўдзелу ў якіх пажадана прыцягнуць людзей старэйшага пакалення, якія спазналі нягоды вайны. Напрыклад,

акцыю **«Вайна ў лёсе маёй сям'і»** можна пачаць з арганізацыі выставы-прагляду і электроннай прэзентацыі на аснове дакументальных матэрыялаў з сямейных архіваў.

Для дзяцей у межах патрыятычных акцый рэкамендуем правесці **гучныя чытанні**:

- «Паэтычны вянок Перамогі»;
- «Пра вайну і пра Перамогу»;
- «Старонкі Перамогі»;
- «Чытаем. Памятаем. Ганарымся».

Пасля чытання вершаў і апавяданняў неабходна прапанаваць дзецям выказаць свае ўражанні аб пачутым або праілюстраваць іх на паперы.

Для моладзі можна арганізаваць **літаратурныя гасцёўні** і **літаратурна-музычныя вечарыны**:

- «А заўтра была вайна»;
- «Была вайна. Была Перамога»;
- «І боль душы, і светлая сляза»;
- «Песні ваенных гадоў»;
- «Песні Перамогі»;
- «Той далёкай вясной 45-га года»;
- «Я пішу табе з вайны».

**Тыдзень ваеннай кнігі «На вайне і пра вайну»** праводзяць з мэтай прыцягнення маладога пакалення да чытання твораў пісьменнікаў-франтавікоў і ў цэлым літаратуры пра вайну. На працягу тыдня дзейнічаюць выставы, праводзяцца конкурсы, віктарыны і іншыя мерапрыемствы.

Падчас тыдня ваеннай кнігі для дзяцей можна арганізаваць **гульню «Салдацкая старонка»** з пляцоўкамі: «Разведка», «Ваенная сувязь», «Палявая пошта», «Алея герояў», «На прывале» і інш. На пляцоўцы «Разведка» неабходна прадэманстраваць сваю фатаграфічную памяць. Вывучыўшы карту за 2 хвіліны, удзельнікі павінны запомніць размяшчэнне жывой сілы і тэхнікі праціўніка, а потым адказаць, колькі танкаў, самалётаў, салдат адзначана на

карце. Заданне пляцоўкі «Ваенная сувязь» заключаецца ў тым, што з літар алфавіта неабходна сабраць загад военачальніка. На пляцоўцы «Палявая пошта» ўдзельнікі павінны запісаць назвы гарадоў-герояў. На «Алеі герояў» па апісанні подзвіга неабходна назваць Героя, які яго здзейсніў. Падчас творчага задання «На прывале» трэба выканаць як мага больш песень ваеннай тэматыкі.

Бібліятэкі імкнуцца здзяйсняць патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення на прыкладзе подзвігаў землякоў падчас **урокаў баявой славы** і **мужнасці**:

- «Адвага. Мужнасць. Гонар»;
- «Вуліцы памятаюць іх імёны»;
- «Вялікая Айчынная ў імёнах і датах»;
- «Героі вогненных гадоў»;
- «Героі Вялікай Перамогі»;
- «І памятае горад пра вайну»;
- «Ішоў салдат дарогай Перамогі»;
- «Малая радзіма ў асобах і фактах»;
- «Малая радзіма ў Вялікай вайне»;
- «Мой край не абыйшла вайна»;
- «Подзвіг нашых землякоў»;
- «Я жыву на вуліцы героя»;
- «Яны прайшлі дарогамі вайны».

Пра лёс дзяцей на вайне можна расказаць падчас **гадзін** і **ўрокаў памяці**:

- «Вайна ўвайшла ў маё дзяцінства»;
- «Дзеці вайны пра вайну»;
- «Дзеці – героі і сведкі вайны»;
- «Дзеці ліхалецця»;
- «Дзяцінства ў салдацкім шынелі»;
- «Маленькія героі Вялікай вайны»;
- «Я помню ўсё».

Памяць пра вайну не сціраецца з гадамі. Дзеці вайны выжылі, выраслі і сталі вядомымі пісьменнікамі. Але вайна не адпускае іх –

прыходзіць ва ўспамінах і ў снах. І каб жахі вайны ніколі не паўтарыліся, яны напісалі апавяданні і вершы для дзяцей. Прапануем арганізаваць **бібліяграфічныя агляды** твораў Алеся Ставера, Анатоля Вярцінскага, Анатоля Грачанікава, Барыса Сачанкі, Віктара Казько, Віктара Кудлачова, Івана Навуменкі, Рыгора Барадуліна, Сяргея Грахоўскага, Янкі Сіпакова і іншых пісьменнікаў. Яны паказалі сучасным дзецям і падлеткам вайну вачыма іх аднагодкаў. Кранальныя і мужныя гісторыі жывых сведак вайны дапамогуць у правядзенні мерапрыемстваў і акцый, прысвечаных памятным датам.

Займальным і карысным для дзяцей можа стаць **майстар-клас па стварэнні лэпбука «Вайна. Перамога. Памяць»**. Лэпбук – кніжка-папка ручной працы, у міні-акенцы якой устаўляюцца рухомыя сімвалы, дэталі і іншае. Напярэдадні Дня Перамогі правесці для школьнікаў майстар-клас па стварэнні лэпбукаў – актуальная ідэя. Дзеці могуць узнавіць абраны ваенны перыяд на старонках такой кнігі, а перасоўныя элементы стануць выдатнай магчымасцю для візуалізацыі і ажыўлення карцінкі.

Рэкамендуем таксама правесці наступныя **майстар-класы**:

- «Букет ветэрану»;
- «Ваенная пілотка»;
- «Голуб міру»;
- «Кветкі Перамогі»;
- «Франтавыя лісты».

Для ўдзелу ў **конкурсе вырабаў «Салют, Перамога!»** школьнікі або студэнты павінны зрабіць унікальны выраб ваеннай тэматыкі. Гэта можа быць рэканструкцыя бітвы, карціна з пластыліну, воску, пясочная карціна і інш. У бібліятэцы ствараецца куток, які служыць пляцоўкай для выставы вырабаў. Шляхам галасавання вызначаюць пераможцу, якога ўзнагароджваюць граматай або падарункам.

Прапануем арганізаваць **конкурсы малюнкаў** і **выставы дзіцячай творчасці** да свята Перамогі. Сутнасць конкурсаў –

намаляваць плакат на ваенную тэму. Можна адлюстраваць гістарычную падзею, герояў вайны або сваіх сваякоў-ветэранаў, святкаванне Дня Перамогі. Тэмы могуць быць наступныя:

- «Вясна Перамогі»;
- «Дзень Перамогі вачыма дзіцяці»;
- «Мы малюем мір»;
- «Перамога вачыма нашчадкаў»;
- «Салдатам прысвячаецца»;
- «Салют Перамогі»;
- «Трывожныя фарбы вайны»;
- «Фарбы Перамогі»;
- «Я малюю Перамогу».

## КОНКУРСЫ ДА МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПАТРЫЯТЫЧНАЙ ТЭМАТЫКІ

Дзеці і падлеткі гуллівыя і дапытлівыя адначасова, таму ім варта прапанаваць і рухомыя гульні, і конкурсы на эрудыцыю. Вельмі ўдалай ідэяй будзе чаргаваць заданні, у якіх неабходна выкарыстоўваць спрыт, хуткасць і фізічную сілу, з інтэлектуальнымі віктарынамі, песнямі або арыгінальнымі загадкамі.

Лепшых гульцоў трэба абавязкова заахвоціць паштоўкамі, памятнымі сувенірамі ці імправізаванымі медалямі. Узнагароджанне надасць мерапрыемству асаблівую ўрачыстасць і спадабаецца не толькі ўдзельнікам, але і гасцям.

Конкурс **«Вялікая Перамога»** разлічаны на камандны ўдзел. У кожнай камандзе павінна быць не больш за 4 чалавекі. Задача – зрабіць шыфр да слова «Перамога» (зашыфраваць кожную літару асобна).

Конкурс **«Парад Перамогі»** лепш за ўсё падыдзе студэнтам і школьнікам. Дзве каманды па 10-15 чалавек выстройваюцца ў шэраг. Каманды па чарзе пачынаюць крочыць страявым крокам, але не простым, а, напрыклад, тры крокі наперад – адзін назад. Важна ісці

ў нагу, роўна і выразна. Перамагае той, хто пройдзе дыстанцыю раўней і не збіваючыся.

Конкурс **«Камандзірскі»** выдатна паспрыяе юнакам у якасці папярэдняй армейскай падрыхтоўкі. Выбіраюць гульцоў, перад якімі ставяць тумбачку з адзеннем салдата. Па камандзе «Пад'ём!» удзельнікі павінны апрануцца як мага хутчэй. Перамагае той, хто першым апрануўся і «гатовы да службы».

У пачатку конкурсу **«Выведнік-следапыт»** удзельнікі ставяць ступню на белы ліст паперы і абводзяць контур. Пасля гэтага адбіткі выразаюць. Сляды збіраюць і аддаюць уперамешку таму, хто водзіць. Задача – правільна вызначыць дзе чый след. Хто адгадае больш слядоў, той і перамагае.

У конкурсе **«Сапёры»** прадстаўнікі ад каманд павінны сабраць за хвіліну як мага болей мін (выраблeных з паперы).

Падчас конкурсу **«Медсанбат»** дзяўчаты з каманд павінны дабрацца да «параненых», зрабіць перавязку і вярнуцца разам з імі ў каманду.

Конкурс **«Знаўцы ваенных фільмаў»** прывівае падрастаючаму пакаленню любоў і павагу да ваенных карцін. Удзельнікам выдаюцца карткі з назвамі фільмаў («А зоры тут ціхія...», «Афіцэры» і г.д.). Гульцы павінны ўсімі даступнымі спосабамі раскрыць змест сюжэту.

У конкурсе **«Добрая памяць»** камандам прапануюцца словы (абаронца, атака, бомба, камандзір, карабель, медаль, міна, мора, парушальнік, перамога, пісталет, пяхота, самалёт, стрэл, танк, узнагарода і інш.), удзельнікі праслухоўваюць іх і спрабуюць напісаць па памяці. Перамагае каманда, якая напісала больш слоў.

Для конкурса **«Прывал»** фарміруюцца 2-3 каманды. Кожная атрымлівае пэўную песню ваеннай тэматыкі. Задача – праспяваць яе найбольш галасіста. Можна выбіраць аднолькавыя песні, каб было лягчэй параўноўваць гучнасць выканання. Для вызначэння пераможцы звычайна выкарыстоўваць апладысменты гасцей.

## ВЫСТАВЫ ДА ДНЯ ПЕРАМОГІ

Дзень Перамогі – важнае свята для кожнага грамадзяніна Беларусі. Падкрэсліць дух адзінства і гонару, нагадаць аб памятнай падзеі ў гісторыі краіны дапаможа **фотазона**, арганізаваная ў бібліятэцы.

Каб стварыць эмацыйную атмасферу і **раскрыць фонд літаратуры** аб Вялікай Айчыннай вайне прапануем арганізаваць:

- выставу-імпульс «Помні…»;
- выставу-набат «Рэха вогненных гадоў»;
- выставу-падарожжа «Доўгія вёрсты Перамогі»;
- выставу-рэквіем «Без тэрміну даўнасці»;
- выставу-рэпартаж «Ніхто не забыты, нішто не забыта»;
- выставу-свята «Вясна! Перамога! Памяць!»;
- выставу ілюстрацый «Вайна вачыма мастакоў».

Прадметы і аксесуары, прадстаўленыя на такіх выставах, паспрыяюць найбольш глыбокаму пранікненню ў тэму. Каля прапанаваных выстаў і экспазіцый можна праводзіць бібліяграфічныя агляды літаратуры, гучныя чытанні, віктарыны.

## ЭПІГРАФЫ ДА ВЫСТАЎ ЛІТАРАТУРЫ

Беларускія вершы пра вайну – гэта летапіс жалю і болю, якія назаўсёды засталіся ў сэрцах людзей. Яны ўсхваляюць мужнасць, сілу і годнасць беларусаў у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Прапануем падборку цытат з вершаў беларускіх паэтаў пра Вялікую Айчынную вайну, якія можна выкарыстаць у якасці эпіграфа да выставы літаратуры.

Гары, святло магутнае вясны,
і ззяй вясёлкай колераў гарачых
над тымі, хто не змог прыйсці з вайны,
хто пераможны гэты май прадбачыў.

*А. Русецкі*

Каб ніколі, каб ніколі
Не спазналі мы ваеннай долі,
Хай гараць, як зоркі ў вышыні,
Перамогі вечныя агні.

*А. Грачанікаў*

Прайсці мы шмат з табой змаглі,
Ішлі праз полымя і дым мы,
Каб болей людзі на зямлі
Не паміралі маладымі.

*А. Пысін*

Суровым быў славуты шлях, –
Такіх няма на свеце.
І шмат загінула ў баях
За ваша шчасце, дзеці.

*П. Глебка*

Навекі слава тым,
што ў полі ратным
загінулі за родныя палі,
за наш народ,
за лёс народаў братніх,
за дзень наступны ўсяе зямлі.

*П. Панчанка*

Плакалі матулі над сынамі,
Што ў баях няроўных палеглі.
У палях, парослых палынамі,
Белыя бярозы ўзышлі.

*Л. Пранчак*

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на такую форму папулярызацыі кніг ваенна-гістарычнай тэматыкі як **флэшбук**. Гэта кніжны флэшмоб у сетцы Інтэрнэт. Флэшбук – знаёмства з цікавымі кнігамі з дапамогай цытат, ілюстрацый, біяграфіі аўтара, яго асабістых перажыванняў і іншай інфармацыі аб выданні. Чытачы могуць дзяліцца сваімі ўражаннямі, рэкамендацыямі, пакідаць заўвагі і парады.

Для размяшчэння ў сетцы Інтэрнэт, дэманстрацыі падчас мерапрыемстваў можна стварыць наступныя **відэасюжэты**:

- «Героі Айчыны»;
- «Герояў слаўныя імёны»;
- «Дакументальныя сведкі вайны»;
- «У полымі Вялікай Айчыннай»;
- «Франтавікі ў сямейным альбоме».

Для дзяцей і падлеткаў рэкамендуем арганізаваць **віртуальныя экскурсіі** і **падарожжы**:

- «Дарогамі вайны»;
- «Дарогамі герояў»;
- «Летапіс Вялікай вайны»;
- «Манументы мужнасці і славы»;
- «Маршруты памяці»;
- «Партызанскімі сцежкамі»;
- «Там, дзе прайшла вайна».

Моладзі можна прапанаваць паўдзельнічаць у **анлайн-віктарынах**:

- «Вайна ў лічбах»;
- «Гераічныя маршруты»;
- «Доўгая дарога да Перамогі»;
- «З чаго пачынаецца памяць…»;
- «Перамога ў памяці жыве»;
- «Я памятаю, я ганаруся!».

## МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ ПАДРЫХТОЎКІ СЦЭНАРЫЯЎ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПА ВЫХАВАННІ ПАТРЫЯТЫЗМУ

**1.** Вялікая Айчынная вайна ў мастацкай літаратуры і мастацтве : бібліяграфічны паказальнік да 75-годдзя Перамогі / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, інфармацыйна-бібліяграфічны сектар ; склад. Ю. Ю. Жыткевіч. — Гродна, 2020. — 24 с.

**2.** Гісторыя вызвалення горада Гродна : да 70-годдзя вызвалення Гродна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў : бібліяграфічны спіс літаратуры / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, інфармацыйна-бібліяграфічны сектар ; уклад. І. М. Ілюшына. — Гродна, 2014. — 33 с.

**3.** Гродна помніць герояў Вялікай Айчыннай вайны : бібліяграфічны даведнік / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, інфармацыйна-бібліяграфічны сектар ; уклад. І. М. Ілюшына. — Гродна, 2021. — 341 с.

**4.** Книга славы города Гродно : биобиблиографический справочник / Государственное учреждение культуры «Централизованная библиотечная система г. Гродно», Гродненская городская центральная библиотека им. А. Е. Макаёнка ; составление, подбор материала : И. Н. Илюшина, Д. В. Крачко ; под общей ред. Н. Г. Свиридо. — Гродно : ООО «ЮрСаПринт», 2017. — 204 с.

**5.** Наш земляк – генерал Антонов : библиографический список к 120-летию со дня рождения уроженца Гродно, генерала Алексея Иннокентьевича Антонова / Государственное учреждение культуры «Централизованная библиотечная система г. Гродно», Гродненская городская центральная библиотека им. А. Макаёнка, информационно-библиографический сектор ; сост. Д. В. Крачко. — Гродно, 2016. — 16 с.

**6.** Падзеі ў манументальнай скульптуры горада Гродна : бібліяграфічны даведнік / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна», Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка, інфармацыйна-бібліяграфічны сектар ; уклад. І. М. Ілюшына. — Гродна, 2022. — 62 с.

**7.** Память о людях в монументальной скульптуре города Гродно : биобиблиографический справочник / Государственное учреждение культуры «Централизованная библиотечная система г. Гродно», Гродненская городская центральная библиотека им. А. Макаёнка, информационно-библиографический сектор ; сост. И. Н. Илюшина. — Гродно, 2019. — 374 с.

**8.** Почётные граждане города Гродно : биобиблиографический справочник / Государственное учреждение культуры «Централизованная библиотечная система г. Гродно», Гродненская городская центральная библиотека им. А. Е. Макаёнка ; составление, подбор материала : И. Н. Илюшина ; под общей ред. Н. Г. Свиридо. — Гродно : Гродненская типография, 2017. — 160 с.

□ □ □

**9.** Арасланова, Л. З. Не умолкнут песни эти : [сценарий ко Дню Победы советского народа над немецко-фашистскими захватчиками] / Лилия Загидулловна Арасланова // Читаем, учимся, играем. — 2020. — № 3. — С. 53–57.

**10.** Барчева, Т. Ф. Аты-баты, шли солдаты! : [сценарий ко Дню защитника Отечества] / Татьяна Фёдоровна Барчева // Читаем, учимся, играем. — 2020. — № 11. — С. 48–53.

**11.** Богатимова, Н. С. «Жди меня, и я вернусь...»: литературно-музыкальный вечер, посвящённый письмам с фронта и поэзии военной поры, для учащихся старших классов / Н. С. Богатимова // Читаем, учимся, играем. — 2021. — № 6. — С. 44–49.

**12.** Герцык, А. В. Тэма дзяцінства, апаленага вайной, у аповесці В. Казько «Суд у слабадзе» : (XI клас) / А. В. Герцык // Беларуская мова і літаратура. — 2021. — № 4. — С. 37–46.

**13.** Глубоковских, М. В. «Я честью и родиной не торгую!» : [сценарий исторического часа, посвящённого генералу Д. М. Карбышеву] / Марина Владимировна Глубоковских // Читаем, учимся, играем. — 2020. — № 7. — С. 56–62.
**14.** Грушэцкая, Т. В. Ваенная тэма ў мастацкай літаратуры : літаратурная гасцёўня для вучняў VII–XI класаў / Т. В. Грушэцкая ; В. Ю. Тыльковіч // Беларуская мова і літаратура. — 2020. — № 4. — С. 58–63.
**15.** Данілішына, А. Пра нашу Перамогу і не толькі : літаратурная гасцёўня / Алена Данілішына ; Вікторыя Петрушкевіч // Роднае слова. — 2020. — № 5. — С. 65–68.
**16.** Ермакова, Е. Г. Никогда не забудем : игра-викторина к 75-летию Победы / Е. Г. Ермакова ; Т. Г. Ткачёва // Пачатковая школа. — 2020. — № 3. — С. 62–64.
**17.** Еўсіевіч, Т. Вялікая Айчынная вайна ў творах В. Быкава, І. Навуменкі, І. Чыгрынава : літаратурная гасцёўня для вучняў 9-11 класаў / Т. Еўсіевіч // Бібліятэка прапануе. — 2010. — № 2. — С. 8–12.
**18.** Жукоўская, С. «Я тут жыву» : паэтычна-пазнавальная вандроўка / С. Жукоўская // Бібліятэка прапануе. — 2022. — № 7. — С. 14–18.
**19.** Зубко, А. С. Тэматычныя заняткі «Вайна – боль і памяць народа» : (для вучняў V–IX класаў) / А. С. Зубко // Беларуская мова і літаратура. — 2020. — № 12. — С. 33–43.
**20.** Кабак, В. «Никто не создан для войны...» : вечер памяти / В. Кабак // Бібліятэка прапануе. — 2022. — № 5. — С. 2–5.
**21.** Кавальчук, Т. Пісаў ён праўду пра мужнасць беларусаў : літаратурыная гадзіна па творчасці Васіля Быкава (IX–XI клас) / Тэрэза Кавальчук // Роднае слова. — 2019. — № 6. — С. 70–72.
**22.** Карповіч, А. У. «Запомнім да сваёй Перамогі шлях...» : літаратурна-музычная кампазіцыя для вучняў V–VIII класаў / А. У. Карповіч // Беларуская мова і літаратура. — 2020. — № 1. — С. 55–60.

**23.** Ковальчук, Т. Хатынь – это память сердца: набат памяти для среднего школьного возраста / Т. Ковальчук // Бібліятэка прапануе. — 2013. — № 2. — С. 6–8.
**24.** Кожемякина, С. А. «Я возьму с собой гвоздики красные...» : [сценарий мастер-класса по изготовлению букета ко Дню Победы] / Светлана Александровна Кожемякина // Читаем, учимся, играем. — 2020. — № 5. — С. 93–95.
**25.** Никитенко, А. «Пусть не будет войны никогда!»: 65-летию Великой Победы посвящается / А. Никитенко // Бібліятэка прапануе. — 2010. — № 4. — С. 4–8.
**26.** Николаенко, А. В. На поляне партизанской : [сценарий мероприятия ко Дню Победы в Великой Отечественной войне] / Анна Васильевна Николаенко // Читаем, учимся, играем. — 2019. — № 8. — С. 67–71.
**27.** Перепелицына, Н. М. «А зори здесь тихие-тихие...» : [сценарий патриотического квеста по повести Б. Л. Васильева] / Наталья Михайловна Перепелицына // Читаем, учимся, играем. — 2020. — № 6. — С. 35–39.
**28.** Петрашкевіч, М. Дарогамі Васіля Быкава : гульня (X–XI класы) / Марына Петрашкевіч // Роднае слова. — 2021. — № 6. — С. 73–79.
**29.** Петрашкевіч, М. Сабакі – героі Вялікай Айчыннай вайны : сцэнарый / М. Петрашкевіч // Бібліятэка прапануе. — 2010. — № 7. — С. 21–23.
**30.** Позина, М. В. «Я остался цел, но это чудо» : [сценарий ко Дню Победы в Великой Отечественной войне] / Марина Валентиновна Позина // Читаем, учимся, играем. — 2019. — № 2. — С. 59–62.
**31.** Понизович, И. Чтобы в памяти чьей-то всегда наше место не занято было... : вечер памяти для учащихся средних классов / И. Понизович // Бібліятэка прапануе. — 2013. — № 2. — С. 9–11.
**32.** Прохарава, А. Вайна – незагойная рана на целе маёй Беларусі... : урок-рэквіем па апавяданні В. У. Быкава «Незагойная рана» / А. Прохарава // Беларуская мова і літаратура. — 2022. — № 4. — С. 4–8.

**33.** Саўчук, А. Чалавек і вайна : [сцэнарый мерапрыемства, прысвечанага творчасці В. Быкава] / Алена Саўчук // Роднае слова. — 2021. — № 6. — С. 60–63.
**34.** Свищёва, Т. А. «О доблестях, о подвигах, о славе...» : [сценарий ко Дню Победы в Великой Отечественной войне] / Татьяна Александровна Свищёва // Читаем, учимся, играем. — 2019. — № 2. — С. 56–58.
**35.** «Сохраним в сердцах своих память светлую о них» : урок мужества, посвящённый Дню Победы // Бібліятэка прапануе. — 2020. — № 5. — С. 5–7.
**36.** Чекун, С. «Расскажи мне о войне…» : литературная гостиная для учащихся VIII–XI классов / С. Чекун // Бібліятэка прапануе. — 2020. — № 7. — С. 10–12.
**37.** Чырвель, А. Мы памятаем! : літаратурна-музычная кампазіцыя // А. Чырвель // Бібліятэка прапануе. — 2021. — № 5. — С. 13–18.

□ □ □

**38.** Названия для выставки ко Дню Победы [Электронный ресурс] // Режим доступа: https://woman-gu.ru/nazvanie/vystavki-k-9-maya/.— Дата доступа: 03.02.2023.
**39.** Названия мероприятий ко Дню Победы [Электронный ресурс] // Режим доступа: https://woman-gu.ru/nazvanie/meropriyatiya-k-9-maya/. — Дата доступа: 03.02.2023.
**40.** Сцэнарыі святаў на беларускай мове. — Рэжым доступу: http://xn-80azkbz6b.xn-80ahe1ag.xn-90ais/. — Дата доступу: 03.02.2023.

Метадычны дапаможнік

**ШЛЯХ МУЖНАСЦІ І СЛАВЫ:**

**работа бібліятэк па патрыятычным выхаванні моладзі**

Укладальнік
**Рубель** Алена Станіславаўна

Рэдактар
**Наземцава** Наталля Юр'еўна